# Піянерская паляна



## Выпуск 3
## Студзень – сакавік 2021

# Чудеса на Рождество




Рождество – время чудес. Необъяснимое чудо ждут всегда и везде. Творить добро нужно руками детей и для детей: сделать других радостнее и счастливее можно только теплом собственных рук и сердец.

Акция "Чудеса на Рождество" не оставила равнодушными и учащихся нашей школы. Каждый год ребята передают свои сувениры, канцтовары для детей-сирот, детей из семей, находящихся в СОП, детям, которые обучаются в школе-интернате.

И этот год не стал исключением. На протяжении декабря месяца наши ребята собирали игрушки, книги, детские журналы, тетрадки, карандаши, ручки, краски, спортинвентарь для таких же детей, как и они сами, чтобы подарить им частичку чуда в преддверии волшебного праздника Рождества.



Педагог-организатор Пан В.В. и классный руководитель Дрозд Н.А. посетили школу-интернат. В доброй дружеской атмосфере педагоги передали собранные подарки, пообщались с ребятами.

***Попека Анастасия, член БРСМ***

# Дзень нараджэння Колі Гойшыка

## 17 студзеня піянеская дружына адзначыла дзень нараджэння дружыннага героя Колі Гойшыка.

Піянеры дружыны кожны год ўшаноўваюць памяць дружыннага героя. Кожны вучань нашай школы ведае маленькую, але гераічную біяграфію піянера-героя. У гэты дзень у школе прайшоў ўрачысты збор дружыны ў гонар дня нараджэння Колі Гойшыка. Рабяты сабраліся ў гісторыка-краязнаўчым музеі, дзе наведалі экспазіцыю, прысвечаную Колі Гойшыку, яго сям'і подзвігу.

***Нагорная Дар'я, член БРСМ***





# Дзень юнага героя-антыфашыста

## 8 лютага адзначаецца Дзень юнага героя-антыфашыста.

Асаблівай ўвагі ў гэты дзень заслугоўваюць піянеры-героі Вялікай Айчыннай вайны. Да вайны гэта былі самыя звычайныя хлапчукі і дзяўчынкі. Вучыліся, дапамагалі старэйшым, гулялі, бегалі-скакалі, разбівалі насы і каленкі. Іх імёны ведалі толькі родныя, аднакласнікі ды сябры.

У гэты дзень у нашай установе прайшлі выхаваўчыя мерапрыемствы, падчас якіх класныя кіраўнікі распавялі рабятам пра подзвігі такіх жа дзяўчынак і хлапчукоў.

Настаўнікі нашай школы пазнаёмілі хлопчыкаў і дзяўчынак з подзвігамі Марата Казея, Валі Коцік, Лёні Голікава, Алега Казлова, Мішы Качана і Колі Шаўчэнка, якія цаной свайго жыцця падарылі нам жыццё.

У музеі навучэнцы 7-9 класаў наведалі выставу "піянеры-героі". Сярод адважных падлеткаў было фота і нашага дружыннага героя Колі Гойшыка.

***Дубоўская Дзіяна, член БРСМ***






# "Мы выбираем помощь пожилым"



Учащиеся нашей школы в рамках акции «Мы выбираем помощь пожилым» оказывали помощь одиноким пожилым людям.



В связи со снегопадами, члены БРСМ оказали помощь в расчистке снега ветеранам педагогического труда, ветерану Великой Отечественной войны Бертошу Василию Григорьевичу.

***Зеленко Максим, член БРСМ***

# Дзень Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь

*15 сакавіка наша краіна адзначае дзяржаўнае свята -*

*Дзень Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.*

У нашай краіне Канстытуцыя - гэта асноўны закон, у якім прапісаны правы і абавязкі кожнага грамадзяніна нашай рэспублікі, выбарчая сістэма, дзяржаўны строй. Дзякуючы Канстытуцыі любы чалавек у нашай краіне мае права на дастойнае жыццё і асабістае развіццё.

Святочны дзень у нашай школе пачаўся з урачыстай лінейкі. Дырэктар школы Наталля Іванаўна павіншавала ўсіх педагогаў і навучэнцаў са святам, пажадала заўсёды быць і заставацца сапраўднымі грамадзянамі сваёй краіны. Госць мерапрыемства, Людміла Міхайлаўна Дубоўская, старшыня Дзяніскавіцкага сельвыканкама, пажадала вучням мірнага неба, берагчы і любіць сваю Радзіму, імкнуцца рабіць яе больш прыгожай.





Традыцыйным 15 сакавіка ў школе стала ўручэнне падарункавага выдання *"Я-грамадзянін Рэспублікі Беларусь."* Гэт ую кнігу ат рымліваюць рабят ы, якім споўнілася 14 гадоў. 15 сакавіка гэты падарунак з рук Людмілы Міхайлаўны атрымаў ***навучэнец 8 класа Карпеня Раман.***

***Яршоў Арцём, член БРСМ***

# "Здаровае пакаленне - здаровая краіна!"

Пад такім дэвізам праходзіла ва ўстанове раённая шматпрофільная акцыя "Молодзь за здаровы лад жыцця". Вучні школы прымалі ўдзел у мерапрыемствах, накіраваных на прафілактыку шкодных звычак, выпрацоўку адказных паводзін за свае ўчынкі адносна здароўя. Вучні 2-11 класаў прынялі ўдзел у акцыі "Лесвіца здароўя". Удзельнікі БРСМ праводзілі з малодшымі дзецьмі рухомыя гульні, спаборніцтвы, арганізавалі вясёлыя рухомыя перапынкі. Вучні 3-6 класаў наведалі спартыўную залу, а вучні 10-11 класа арганізавалі спаборніцтва па настольнаму тэнісу. Кожны з рабят асабістым прыкладам паказаў неабходнасць здаровага ладу жыцця.

1 сакавіка адзначаецца Міжнародны дзень барацьбы з наркаманіяй. удзельнікі МІГ арганізавалі і правялі акцыю акцыю "Наркотыкам-не!". Падчас акцыі кожны з рабят рабіў выбар: жыць без наркотыкаў (выбіраў зялёнае яблык), або адысці ў бездань (выбіраў чырвоную далонь). Усе ўдзельнікі акцыі абралі зялёнае яблык, як сімвал жыцця, здаровага ладу жыцця. Удзельнікі акцыі імкнуліся да таго, каб данесці да кожнага, што здароўе, здаровы лад жыцця, жыццё без наркотыкаў - гэта модна!

Класныя кіраўнікі правялі з вучнямі 2-11 класаў гутаркі, заняткі, трэнінгі, накіраваныя на выпрацоўку адказных паводзін за сваё жыццё.

***Карпеня Раман, піянер дружыны імя Колі Гойшыка***









# Дзень памяці ахвяр Хатыні



***22 сакавіка ва ўстанове прайшоў Дзень памяці ахвяр Хатыні.***

Класныя кіраўнікі правялі выхаваўчыя мерапрыемствы ў гонар памяці ахвяр спаленых вёсак.Сярод навучэнцаў 9-11 класаў прайшоў урок мужнасці "Хатынь: вёска, якой няма". Вучаніца 11 класа Дзенісеня Ганна пазнаёміла вучняў з трагічнай гісторыяй Хатыні, якая стала сімвалам такіх вёсак, была спаленая з усімі жыхарамі: людзмі сталага узросту і дзецьмі. Нікога не пашкадавалі падчас вайны фашысцкія захопнікі. Каб памяць пра герояў жыла вечна, у гэты дзень, 22 сакавіка, навучэнцы нашай школы ўспамінаюць гэтыя падзеі.



Сябры БРСМ далучыліся ў акцыі "памяці сясцёр Хатыні" і навялі парадак на брацкай магіле.



***Швайка Вольга, член БРСМ***

# ВІНШУЕМ НАШЫХ ПЕРАМОЖЦАЎ

У студзені ва ўсіх рэгіёнах Беларусі завяршыліся абласныя спаборніцтвы "Снежнага снайпера", якія праходзяць на прызы Прэзідэнцкага спартыўнага клуба. Змагаюцца за перамогу тут хлопчыкі і дзяўчынкі, якія прафесійна біятлонам ніколі не займаліся, але горача захопленыя гэтым відам спорту. Для юных спартсменаў "Снежны снайпер" - гэта не толькі спаборніцтва, але і магчымасць актыўна бавіць час і займець шмат новых сяброў. Вучаніца 11 класа нашай школы Дзенісеня Ганна заняла ганаровае першае месца у старшай узроставай групе.







Навучэнцы нашай школы прынялі ўдзел у абласных спаборніцтвах па валейболе, якія прайшлі ў лютым. Зялёнка Максім і Яршоў Арцём увайшлі ў склад зборнай каманды раёна. Спаборніцтвы праходзілі ў г. Кобрыне. У складзе каманды Максім і Арцём занялі 3 месца.

***Швайка Вольга, член БРСМ***

Ганцавіцкі раён
в.Дзяніскавічы
вул. Леніна 93а
Тэлефон: 8 0164651138
Сайт: https://deniskovichi.schools.by
E-mail: deniskovichi@gancevichi.edu.by

«Піянерская паляна»
Тыраж 4 экзэмпляры
Выданне надрукавана
на прынтэры фармата А4

2021 год

Галоўны рэдактар: Лаўрэнцьева І.П.
Рэдактар: Гардзей Г.М.
Аўтары: школьны прэс-цэнтр
Рэцэнзент: Берташ Н.І.

ДУА «Дзяніскавіцкі
яслі-сад—сярэдняя школа»